№ 46 (591)
Снежань 2015 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

У нумары:

☞ Асоба ў краязнаўстве: *Алесь Корнеў –* *стар. 2*

☞ Неабыякавае: *уратаваць будынак кляштара ў Оршы –* *стар. 3*

☞ Руплівец: *летапісец Пастаўшчыны Ігар Пракаповіч –* *стар. 5*

☞ Повязі: *гетман Дарашэнка і Магілёў –* *стар. 6*

Рэшткі кляштара базыльянаў у Оршы (2013 год)

Мецэнат для музея

26 лістапада ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адбылася прэзентацыя кнігі-альбома «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь» – сумеснага выдавецкага праекта музея, ААТ «Прыёрбанк» і ганаровага консульства Аўстрыйскай Рэспублікі ў Мінску. Выдавец – А. Аляксееў.

Кніга-альбом падрыхтаваная аўтарскім калектывам музея, яе выхаду ў свет папярэднічала вялікая навуковая праца па атрыбуцыі і рэстаўрацыі музейных прадметаў, даследаванні гісторыі фармавання ўнікальнага збору вядучага гістарычнага музея краіны, шматгадовай дзейнасці некалькіх пакаленняў музейных работнікаў.

У выданне ўключаныя новыя факты з гісторыі стварэння музея. Праведзены карпатлівы адбор фондавых матэрыялаў, што дало магчымасць стварыць структуру альбома, дзе ў патрэбных для выдання падобнага характару суадносінах прадстаўлены як шырокі ілюстрацыйны матэрыял, так і тэксты блок на трох мовах – беларускай, рускай, англійскай. Гэта робіць выданне даступным для самай шырокай аўдыторыі. Папярэдні альбом, прысвечаны гісторыі і калекцыям музея, пабачыў свет амаль 30 гадоў таму, калі ўстанова яшчэ мела назву «Дзяржаўны музей БССР».

Гэты выдавецкі праект быў рэалізаваны пры фінансавай падтрымцы ААТ «Прыёрбанк», што сведчыць пра адраджэнне традыцыяў мецэнацтва ў Беларусі.

Ва ўмовах адсутнасці паўнавартаснай стацыянарнай экспазіцыі альбом ілюструе патэнцыял музея. За тры месяцы, што прайшлі з дня яго выхаду ў свет, з выданнем пазнаёміліся паслы шэрагу замежных краінаў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, шырокая аўдыторыя музейных спецыялістаў, і, як вынік, музей атрымаў прапановы па арганізацыі выставак па-за межамі краіны да 2017 года.

Паводле інфармацыі арганізатараў

На тым тыдні...

✓ **28 лістапада** ў пасёлку Ждановічы пад Мінскам адбылася **XV Канферэнцыя стваральнікаў радавых сядзібаў**. Пад час мерапрыемства былі зладжаныя тэматычныя круглыя сталы па земляробстве, па сямейнай адукацыі, выхаванні дзяцей і інш., прайшоў майстар-клас па сярэднявечных беларускіх танцах.

✓ **1 снежня** ў мінскай сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны адбылася **прэзентацыя кнігі ўспамінаў і лістоў Зоські Верас «Пакуль рука пяро трымае»**. Вядоўца вечарыны – укладальнік кнігі Міхась Скобла.

Падрабязней чытайце ў наступным нумары.

✓ **1 снежня** ў галерэі «Універсітэт культуры» ў Палацы Рэспублікі адкрылася першая **персанальная выстаўка Іны Салдатавай «Арт-хворь»**. На выстаўцы прадстаўленыя творы жывапісу і арт-аб'екты, створаныя аўтаркай за апошнія пяць гадоў.

Цягам некалькіх гадоў І. Салдатава выкладала ў адной з мінскіх школаў мастацтваў, працавала дызайнерам у Беларускім тэлеграфным агенцтве. З 2008 г. бярэ ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках і арт-праектах.

✓ **1 снежня** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў у Мінску адкрыліся дзве **выстаўкі эксперыментальнага тэкстылю Латвіі: «Вібрацыі матэрыялаў» і «Канцэнтраваныя думкі»**. Праекты рэалізуюцца пры падтрымцы Пасольства Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь.

✓ **2 снежня** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылася чарговая **сустрэча сумеснага з парталам Textura.by праекта «Літаратурная серада ў музеі Петруся Броўкі»**. Увазе наведнікаў былі прадстаўленыя аўтары партала Андрэй Бастунец, Інэса Ганкіна, Алег Гаркун, Надзея Кахновіч, Ганна Комар і Кацярына Шчасная.

✓ **4 снежня** ў Брэсце адзначылі **350 гадоў з дня пачатку працы Берасцейскага манетнага двара**. Ён існаваў з 4 снежня 1665 г. па 16 снежня 1666 г., за гэты час было адчаканена больш за 240 мільёнаў медных шэлегаў. Адмыслова да юбілейнай даты РУП «Белпошта» выдала паштоўкі з выяваю манетнага двара. Пад час святочных мерапрыемстваў, што ладзіліся на базе Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, можна было пабачыць арыгінальныя медныя соліды, адчаканеныя 350 гадоў таму.

✓ **5 снежня** ў філіяле Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва «Арт-пространство» адкрыўся **праект-прысвячэнне М.К. Агінскаму «250»**, які знаёміць наведнікаў з творчым пераасэнсаваннем жыцця і спадчыны кампазітара. Праект быў зладжаны пры падтрымцы фонду «Вяртанне».

Увага, запрашаем!
15 снежня 2015 г. з 12-00 да 14-00 гадзінаў у Доме дружбы грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі» (г. Мінск, вул. Захарава, 28) адбудзецца выстаўка-продаж навагодніх сувеніраў Маладзечанскай фабрыкі мастацкіх вырабаў Беларускага фонду культуры. Запрашаем наведаць нашу выстаўку!

БФК

Сябры! Нагадваем, што ідзе падпіска на «Краязнаўчую газету» на 2016 г. Заставайцеся з намі! Далучайце сяброў і калегаў!

«Сэрца, ты – маё вечнае полымя...»

Так піша і жыве паэт, краязнаўца Алесь Корнеў, якому напрыканцы лістапада споўнілася 80 восеняў. Ён нарадзіўся 30 лістапада 1935 г. у Лупалаве – прыгарадзе Магілёва, з 1940 г. жыў на Міншчыне, з 1944 г. у асноўным на Брэстчыне. У 1960 г. скончыў Мінскі медінстытут, жыў у Мазыры, з 1961 г. – у Баранавічах.

Яшчэ са школы быў неабыякавы да паэзіі і краязнаўства, але ўзяў з імі «шлюб» толькі ў сталыя гады. На пенсіі выпусціў у свет больш за 20 зборнікаў. За свае творчыя дасягненні атрымаў дзве абласныя літаратурныя прэміі – «Мядовую» і імя У.А. Калеснікава. Свае краязнаўчыя сцежкі Аляксандр Касьянавіч праклаў не толькі ў Баранавічах і яго наваколлях, але і ў Мастах, Уздзе, Пружанах, Лунінцы, на Зэльвеншчыне, Ганцавіччыне і іншых мясцінах.

«Краязнаўчая газета» і іншыя выданні пісалі пра А. Корнева, пра яго кнігі лірыкі і краязнаўчыя творы, асабліва пра зборнікі «Крыжы зямелькі нашай» (2012), «Праз міфы і казкі» (2004).

Да свайго юбілею А. Корнеў выпусціў літаратурна-мастацкае выданне «Хмаркі-аблокі радзімай старонкі» (2015), прадмову да яго напісала крытык Алена Шумаева:

Таму і я за побыт свой
і шчасце
Адказнасць на сябе
спяшаю ўскласці!

Сярод краязнаўчых нізак твораў і вершаў аўтара варта адзначыць такія, як «Шчэ не забыты пах вайны Сусветнай», «Ля кастра на Купалле», «У цыгана – не тая школа, змяніў ён капыты на кола», «Дзе воблачкі з руна, там хатка Перуна», «Паехаў дзед на Ганненскі кірмаш», «Нашчадку Гаруна», баладу «Вялікі Угрын, хай сяло як сяло, ды ўсё-ткі за сэрца паданне ўзяло»:

І рэчкі, і вёскі,
тым больш гарады,
Якія ў вас часам
цікавыя назвы?!
Таму і не дзіва,
што імі заўжды
Хоць насамахоць
зацікавіце нас вы.

З'яўленне такіх зборнікаў, як «Хмаркі-аблокі радзімай старонкі», несумненна, адметная падзея, і я шчыра жадаю аўтару натхнення, невычэрпнай энергіі, моцнага здароўя, шчасця і вялікіх перамогаў у літаратуры і краязнаўстве.

Міхась МАЛІНОЎСКІ,
г. Баранавічы

«Краязнаўчая газета» вітае юбіляра і далучаецца да віншаванняў. Здароўя і поспехаў, Алесь Касьянавіч!

Мацярык Беларусь

Тым часам у Латвіі...

Мастака (справа) віншуюць старшыня Тэрвецкай Думы Д. Рэйніка і дырэктар Дома культуры В. Страпцанс

• 14 лістапада, напярэдадні 97-х угодкаў абвяшчэння Латвійскай незалежнай дзяржавы, у Тэрвецкім доме культуры адкрылася персанальная выстаўка жывапісу і графікі розных гадоў мастака Вячкі Целеша «Тэрвецкія дотыкі». Тэрветэ – творчая майстэрня мастака ў Латвіі. У студзені наступнага года будзе 40 гадоў, як пасля заканчэння Латвійскай акадэміі мастацтваў В. Целеш упершыню прыехаў у тыя мясціны. За чатыры дзесяцігоддзі творчай працы тут былі створаныя сотні малюнкаў, жывапісных эцюдаў, пейзажаў, партрэтаў жыхароў гэтага прыгожага краю.

• У Рызе 20 лістапада адбылася прэзентацыя кнігі выбраных твораў Вольгі і Сяргея Сахаравых, адным з укладальнікаў і выдаўцоў якой з'яўляецца Міхась Казлоўскі, а ідэя стварэння выдання належыць паэту Сяргею Панізьніку. Мерапрыемства зладзілі Акадэмічная бібліятэка Латвійскага ўніверсітэта, Беларускі інфармацыйны цэнтр і Латвійскае таварыства беларускай культуры «Сьвітанак».

Муж і жонка Сахаравы, ураджэнцы Віцебшчыны, былі добрымі педагогамі, пра якіх са шчырай падзякай узгадвалі вучні. С. Сахараў збіраў этнаграфічныя матэрыялы, займаўся публіцыстыкай. Яго жонка пісала вершы і драматычныя творы. Вершы В. Сахаравай хоць і не вельмі дасканалыя, але шчырыя, у іх адчуваецца подых эпохі.

Падрыхтавала Ніна КАЗЛЕНЯ

С. Панізьнік і М. Казлоўскі

Унучка Сахаравых Нона

Нашы віншаванні

У 1984 г. на базе школьнага музея ў г. Браславе, арганізатарам і кіраўніком якога з'яўляўся настаўнік гісторыі і краязнаўца А. Гарэлік, быў заснаваны гісторыка-краязнаўчы музей. Для наведнікаў адкрыўся ў кастрычніку 1988 г.

У 1989 г. музей стаў ініцыятарам стварэння Дома рамёстваў, у музейных памяшканнях пачалі працаваць гурткі па ткацтве, салома- і лозапляценні, глінянай пластыцы. У 1996 г. Дом рамёстваў быў рэарганізаваны ў Музей рамёстваў (цяпер Музей традыцыйнай культуры). На базе двух музеяў было створанае Браслаўскае музейнае аб'яднанне, якое ў 2001 г. атрымала статус юрыдычнай асобы і стала называцца «Навукова-даследчая ўстанова культуры "Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў"».

У гісторыка-краязнаўчым музеі дэманструюцца археалагічныя матэрыялы з курганнага могільніка Укля, скандынаўская фібула IX ст., ляпны гаршчок X ст. з Браслава, прасліцы XI – XIII стст. з Дрысвятаў, кафля і зброя з замка ў Іказні, кафля, посуд і манеты з сярэднявечнай Друі. Адлюстраваная гісторыя Браслаўшчыны часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, падзеі вайны 1812 г., паўстання 1863 – 1864 гг. Экспануюцца матэрыялы пачатку XX ст., перыяду ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад Польшчы. У музеі створаны куток сялянскай хаты канца XIX – XX стст. Зберагаюцца дакументы пра дзейнасць падпольных антыфашысцкіх арганізацыяў, вызваленне краю ад захопнікаў. Асобныя экспазіцыі прысвечаныя мастаку П. Сергіевічу, медыку С. Нарбуту.

Музей традыцыйнай культуры размешчаны ў адрэстаўраваным будынку млына пачатку XX ст. і ў новапабудаваных памяшканнях. У пастаяннай экспазіцыі адлюстраваныя важнейшыя рамёствы рэгіёна: пляценне, разьбярства, ткацтва, ганчарства ды інш.

З 2003 г. дзейнічае экспазіцыйна-гасцінічны комплекс «Заезны двор». Яго экспазіцыя была створаная на аснове гістарычных матэрыялаў і фотаздымкаў і адлюстроўвае гісторыю корчмаў і заезных двароў Браслаўшчыны.

Беларускі фонд культуры і рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» віншуюць супрацоўнікаў з дваццацігоддзем установы, зычаць і надалей плённа шукаць ды захоўваць гістарычныя багацці Браслаўшчыны.

Музейныя праекты

➤ ***8 снежня Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь прэзентаваў перасоўны выставачны праект «Беларусь і беларусы».***

Выстаўка мае на мэце прадставіць гісторыю і культуру нашай дзяржавы за межамі. Гэта першы перасоўны праект, што спрабуе дасціпнай мовай распавесці аб асноўных этапах гістарычнага развіцця Беларусі, даць кароткую характарыстыку культурным здабыткам, прадставіць беларускую нацыю як неад'емную частку сусветнай супольнасці, дапаможа зразумець, што такое Беларусь і хто такія беларусы.

Выстаўка «Беларусь і беларусы» складаецца з мабільных канструкцыяў, дзе размешчаныя высокаякасныя тэматычныя выявы, фотаздымкі прадметаў, дакументаў, невялікія тлумачальныя тэксты на беларускай і англійскай мовах. Змест падзяляецца на два тэматычныя блокі: адзін прысвечаны гісторыі Беларусі, другі – культурным здабыткам. Падаецца кароткі гістарычны агляд, што закранае асноўныя этапы (старажытнасць, першыя дзяржаўныя ўтварэнні, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя, Савецкая Беларусь, сучаснасць), раскрываюцца асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці беларусаў.

➤ ***15 снежня Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрашае на ўрачыстае адкрыццё новай літаратурна-дакументальнай экспазіцыі Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка «Ляўкі» (Аршанскі раён).***

У 1935 г. Беларусь на дзяржаўным узроўні святкавала 30-годдзе творчай дзейнасці Янкі Купалы. Народны паэт атрымаў дарагі яго сэрцу падарунак – дачу ў Ляўках, якую называў «беларускай хаткай над Дняпром». Упершыню ён як пачэсны госць наведаў Ляўкі ў красавіку 1935-га, пад час творчай камандзіроўкі. Пачуццё радасці ад маляўнічых краявідаў і сустрэчаў з мясцовымі жыхарамі захвоціла паэта прыехаць сюды на адпачынак разам з жонкай Уладзіславай Францаўнай, у чэрвені – жніўні 1935 г.

У новай экспазіцыі часткова адноўлены інтэр'ер пакоя былой сядзібы Копыскага лясніцтва, у якім жыў класік і, натхнёны падзеямі і сустрэчамі ў Ляўках, стварыў васямнаццаць вершаў «ляўкоўскага цыкла». Творы – адметная з'ява ў айчыннай паэзіі 1930-х гг. – леглі ў аснову тэматычных комплексаў. Праз вобразы вершаў «Госці», «Вечарынка», «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Старыя акопы» раскрываецца спецыфіка творчага працэсу 1930-х гг., адметнасць культурнага і гаспадарчага жыцця Беларусі, а таксама гісторыя гэтага куточка Аршаншчыны, якую добра ведаў пісьменнік.

Атмасферу Ляўкоў часоў Янкі Купалы перададуць аўдыязапісы голасу Песняра, музычныя творы на яго словы, народная музыка, спевы птушак.

Словамі Янкі Купалы – «Ка мне, у лес над Дняпром» – супрацоўнікі музея Песняра запрашаюць у Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі».

Паводле інфармацыі арганізатараў

Ліст у рэдакцыю «КГ»

Асноўны наш клопат – пра журботныя руіны, у якія ператварыўся помнік архітэктуры і гісторыі рэспубліканскага значэння, былы жылы будынак базыльянскага кляштара ў Оршы.

Мы ўстрывожаныя небяспекай цалкам страціць гэты помнік, які і так моцна пацярпеў ад часу і людзей.

Намі рухае нязгода з тым уражаннем пра аршанцаў, якое пакідае ў кожнага госця горада цяперашні выгляд гэтай архітэктурнай каштоўнасці, паколькі знаходзіцца яна побач з асноўным шляхам, што злучае горад з чыгуначным і аўтобусным вакзаламі. Але, на жаль, нашага клопату пра аблічча роднага горада і рэпутацыю ягоных жыхароў не падзяляюць цяперашнія гаспадары з аднаго з прыходаў Беларускай Праваслаўнай Царквы. Яны каторы год зацягваюць справу аднаўлення гэтага будынка, і нават лічаць магчымым поўнасцю ігнараваць звароты грамадскасці з гэтай нагоды.

Вось і цяпер наш ліст, накіраваны 29 ліпеня на імя Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі праігнараваны. Мы не атрымалі нават адпіскі...

Мы дапускаем, што адрасат нашага ліста проста стаў ахвярай бюракратызму і нядбайных памочнікаў, і проста не меў шанцу пазнаёміцца з меркаваннямі і пытаннямі, што ўтрымліваліся ў нашым лісце.

Каб выправіць гэтую недарэчнасць, мы просім размясціць тэкст нашага ліста на старонках вашага выдання.

Высокапраасвяшчэннейшы Уладыка Павел!

У лістападзе мінулага года мы, аршанскія краязнаўцы, накіравалі Архіепіскапу Віцебскаму і Аршанскаму Дзімітрыю наш калектыўны ліст, прысвечаны лёсу помніка архітэктуры XVIII ст., жылога будынка былога кляштара базыльянаў у Оршы, які цяпер належыць прыходу Свята-Пакроўскага храма горада Орша Віцебскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Гэты будынак занесены ў спіс помнікаў архітэктуры і гісторыі рэспубліканскага значэння. Ягоныя ўладальнікі неаднаразова абяцалі зрабіць усё неабходнае для яго захавання. У прыватнасці, у адказе Архіепіскапа Віцебскага і Аршанскага Дзімітрыя гаворыцца: *«Витебская епархия делает всё возможное, чтобы восстановить эту святыню в её первозданном виде»*.

Аднак прайшло ўжо два месяцы з дня 30 красавіка, якім быў датаваны гэты ліст. Прайшло ўжо мінімум тры месяцы з пачатку будаўнічага сезона, які ў гэтым годзе характарызуецца надзвычай спрыяльнымі прыроднымі ўмовамі. Засталося толькі два летнія месяцы, і не болей чатырох месяцаў да той пары, калі наш клімат зробіць немагчымымі любыя будаўнічыя працы. (Аўтары ліста вядуць адлік часу, пачынаючы з даты накіравання свайго першага ліста Архіепіскапу Дзімітрыю.–**«КГ»**)

Такім чынам, паступова памяншаецца верагоднасць таго, што будынак нарэшце будзе накрыты дахам, і ягонае паступовае і няўхільнае разбурэнне спыніцца. Пачынаючы з 2009 г. прадстаўнікі аршанскай грамадскасці звяртаюцца ў разнастайныя інстанцыі з нагоды пагрозы для існавання гэтага помніка. З таго часу прайшло амаль 6 гадоў. Цяперашні стан помніка можна назваць катастрафічным, бо ўжо больш за 10 гадоў ён стаіць без даху, і драўляныя перакрыцці гніюць з-за пастаяннага ўздзеяння вільгаці. З гэтай самай прычыны разбураецца і цэгла, з якой пабудаваны помнік. І хаця прадстаўнікі Віцебскай епархіі ў сваім лісце сцвярджаюць, што ўсе ваконныя праёмы забітыя дошкамі, частка з іх дагэтуль зеўраюць скразнымі вялікімі дзіркамі. Праз гэтыя дзіркі можна добра разгледзець, што на другім паверсе будынка падняўся ўжо невысокі пакуль бярозавы лясок. Гэта значыць, што цяпер разбурэнне перакрыццяў адбываецца яшчэ і з дапамогаю карнявой сістэмы гэтых дрэваў. Дзіўна, што на гэта не звяртаюць увагі тыя, каму належыць цяпер гэты будынак.

У кастрычніку 2013 г. аршанскія краязнаўцы звярталіся да Вашага папярэдніка на пасадзе кіраўніка Беларускай Праваслаўнай Царквы, Ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, мітрапаліта Філарэта і атрымалі вельмі добры і зацікаўлены адказ. У ім паведамлялася, што наш ліст быў накіраваны Архіепіскапу Віцебскаму і Аршанскаму Дзімітрыю дзеля «канструктыўнага супрацоўніцтва».

У сакавіку 2014 года мы атрымалі ліст ад «ответственных за возрождение Свято-Покровского монастыря г. Орша игуменьи Анфисы (Любчак) и монахини Даниилы (Тятьковай)». У гэтым лісце было абяцанне пасля атрымання дазволу Міністэрства культуры распачаць рэстаўрацыйныя працы ў красавіку гэтага ж года.

Будынак былога базыльянскага кляштара ў Оршы. Фота 2012 г.

Але прайшоў красавік, а потым і 2014 год цалкам, пачаўся новы год, прайшоў і красавік 2015 года, а працы так і не пачаліся. Замест гэтага ў двары з'явіўся новы дыхтоўны будынак на два паверхі, нібыта прызначаны для захавання будматэрыялаў.

У лістападзе 2014 г. мы напісалі пра сваю трывогу ў сувязі з гэтым Архіепіскапу Віцебскаму і Аршанскаму Дзімітрыю, але, насуперак рэкамендацыі пра «канструктыўнае супрацоўніцтва», ён не палічыў патрэбным нам адказаць.

Анічога не скранулася з мёртвай кропкі і ў справе рэстаўрацыі.

Тады ўвесну мы накіравалі свой ліст Архіепіскапу Віцебскаму і Аршанскаму Дзімітрыю яшчэ раз, а, каб быць пэўнымі, што на гэты раз змест нашага ліста дакладна стане яму вядомым, мы накіравалі копіі гэтага ліста шэрагу беларускіх медыяў. І толькі пасля гэтага мы атрымалі адказ, які на дзве траціны складаўся з пераказу агульнавядомых звестак пра гістарычнае мінулае помніка, не толькі добра вядомых аршанскім краязнаўцам, але і даступных усім аматарам даўніны.

Апошняя траціна ліста ўтрымлівала падрабязны аповед пра тое, куды і як звярталася Віцебская епархія дзеля абследавання будынка.

І ні слова не было сказана ў лісце пра пачатак рэстаўрацыі, толькі звесткі пра тое, што *«проектно-сметная документацня... готова на 85%»* і што *«изысканы средства для её оплаты»*.

Завяршаецца ліст наступным паведамленнем: *«...мы работаем над тем, чтобы этот памятник архитектуры был включён в государственную инвестиционную программу реставрации»*.

Гэта можа значыць, што выдзяляць свае сродкі на рэстаўрацыю Віцебская епархія цяпер нават і не плануе, а лічыць за лепшае дачакацца дзяржаўнага фінансавання. Для будынка гэта можа абазначаць працяг разбурэння, і нават канчатковы сыход у нябыт. Тым не меней, мы не пакідаем надзеі, што гэта толькі непаразуменне ў выніку памылковай фармулёўкі.

Але калі намеры Віцебскай епархіі адносна будынка былога базыльянскага кляштара выкладзены карэктна, то гэта будзе абазначаць, што 2015 год, на які прыпадае дзесяцігадовы юбілей пераходу помніка ва ўласнасць БПЦ, таксама анічога не зменіць у ягоным сучасным гаротным стане і трагічнай будучыні.

Асабліва непрыемна гэта выглядае ў святле абвешчанага Віцебскай епархіяй намеру пабудаваць у абласным цэнтры Сафійскі сабор, які, як можна меркаваць, запатрабуе істотных фінансавых укладанняў. Тым болей, што сам гэты праект выглядае не зусім дарэчным з пункту гледжання гістарычнай абгрунтаванасці, паколькі «Сафійскі сабор» – гэта не проста назва. Саборы з такой назваю ўзводзіліся ў якасці сімвалаў дзяржаўнасці пэўных земляў, і што, у такім выпадку, мусіць значыць узвядзенне Сафійскага сабора ў Віцебску? Нават у лепшым выпадку гэты праект выкліча насмешкі і знявагі на адрас кіраўніцтва епархіі і нанясе сур'ёзныя страты рэпутацыі БПЦ у краіне. Ці не варта замест гэтага выкарыстаць запланаваныя на рэалізацыю гэтага праекта сродкі на паўнавартасную рэстаўрацыю згаданага вышэй архітэктурнага помніка, у ліку многіх іншых помнікаў, што патрабуюць неадкладнай увагі з боку іх цяперашніх уладальнікаў – прыходаў БПЦ? Нам здаецца, гэта ў большай меры магло б паспрыяць падвышэнню прэстыжу праваслаўнай царквы ў краіне, усталяванню большага даверу да яе з боку актыўных абаронцаў і стваральнікаў культурных каштоўнасцяў, наладжванню ўзаемапаразумення і згоды паміж царквой, грамадствам і дзяржавай.

Таццяна ВАРОНІНА, Віктар МІХАСЁЎ, Віктар СЦЯПАНАЎ, Віталь ПАЎЛАЎ, Віктар ТАРАСАЎ, Юры РУДНІК

Фота 2013 г.

Ад рэдакцыі. ***Па дамоўленасці галоўнага рэдактара «КГ» з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь апошняе зробіць (у межах сваёй кампетэнцыі) захады для забеспячэння захаванасці муроў базыльянскага кляштара ў Оршы.***

Разам з тым, хацелася б параіць мясцовай грамадскай супольнасці больш цесна кантактаваць (а не канфліктаваць) з мясцовымі царкоўнымі асяродкамі, і многія пытанні захавання таго ж базыльянскага кляштара вырашаць сумесна (у межах распрацаванай архітэктарам М. Лук'янчыкам дакументацыі). Валанцёрства заўсёды ўхвалялася ў нашай краіне. Думаецца, і ў Оршы такія прыклады ёсць, і яны былі б дарэчы ў адносінах да муроў, пра якія дбаюць аўтары змешчанага ў нашым выданні ліста.

Грушаўка ў часы Першай сусветнай вайны

Вёска Грушаўка добра вядомая чытачам «КГ» як месца нараджэння Тадэвуша Рэйтана (1740 – 1780). Гісторыя вёскі, а дакладней, сядзібы, збольшага знаёмая дасціпным даследчыкам. Але белыя плямы ўсё ж застаюцца. Да нядаўняга часу мала што было вядома пра яе лёс пад час вайны 1914 – 1917 гг., што сякерай і вогнішчам прайшлася па тэрыторыі Беларусі. І вось заслона паціху прыадчыняецца.

Год таму ў інтэрнэце, дзякуючы невядомаму рупліўцу пад імем «Дерсу», з'явіліся 4 каштоўныя здымкі сядзібы і капліцы-пахавальні Рэйтанаў, з архіва Л. Свяценкі. Тры з іх датаваныя – чэрвень 1916, 10 мая і ліпень 1917-га. Усе здымкі, як сведчыць «Дерсу» (Свяценка?), падпісаныя адным і тым жа чалавекам – Мікалаем Дзенісенкам, штабным фатографам і «летнабам» 9-га армейскага корпуса 3-й арміі, якая да пачатку вайны 1914 г. была ў складзе Кіеўскай вайсковай акругі. Цікава, што за год, калі 9-ы корпус стаяў у ваколіцах Грушаўкі, тройчы змяніліся яго камандуючыя генерал-лейтэнанты: А. Драгамірaў, М. Кісялеўскі, П. Шрайдэр.

Штаб 9-га армейскага корпуса. Аператыўны аддзел

Што да асобы фатографа, то «летнаб» – гэта лётчык-назіральнік. Падобна, што ён праслухаў курсы і налятаў неабходную колькасць гадзінаў у Качы (Севастопальская Яго Імператарскай Высокасці Вялікага князя Аляксандра Міхайлавіча ваенная авіяцыйная школа). Пасля чаго «асядлаў» нейкі лятальны апарат 9 корпуса.

Здымкі, што тычыліся палётаў над нямецкімі пазіцыямі, ён, відавочна, перадаваў у штаб, а вось тое, што было зробленае для сябе, з цягам часу стала усеагульным здабыткам. А гэта каштоўныя фотаздымкі сядзібаў, нейкіх святаў, гарадоў і іншага.

Як засведчыў сваёй камерай штабны фатограф, у Грушаўскай сядзібе месціўся штаб 9-га армейскага корпуса, у мезаніне – чарцёжная фотаметрычнай часці. Аператыўны аддзел знаходзіўся ў нейкай іншай сядзібнай пабудове, мажліва, знішчаным доме аканома.

Акрамя здымкаў, зробленых на тэрыторыі сядзібы, спадар Дзенісенка пакінуў два здымкі капліцы-пахавальні роду Рэйтанаў (якія ён падпісаў з памылкай – «часовня Рейтеля»).

Каштоўнасць іх у тым, што пастаўлена кропка ў пытанні, калі пачалі будаваць гэтую капліцу ў неагатычным стылі, даволі папулярным на нашых землях у пачатку XX ст. Як вядома, апошні з роду Рэйтанаў, Язэп, хворы на сухоты, памёр 17 жніўня 1910 г. Першы ж здымак капліцы зроблены ў маі 1917 г. На ім добра бачна, што яна яшчэ не мае агароджы і нават дзвярэй. Вежа і дах, што ўзвышаліся над маладым лесам, былі замаскаваныя галінамі. Мажліва, у вежы быў назіральны пункт, а пры капліцы, схаванай лесам, месцілася яшчэ якаясь часць корпуса.

Капліца Рэйтанаў (10 мая 1917 г.)

Праз месяц, пасля таго, як у ліпені 1917 г. быў зроблены другі здымак каля капліцы, штаб перамясціўся ў сядзібу Яленскіх, што ў в. Туча. Дарэчы, да таго, як расійскія войскі атабарыліся ў Грушаўцы, штаб 9-га корпуса год стаяў у нясвіжскім замку Радзівілаў.

Зусім нядаўна знайшоўся адказ яшчэ на адно пытанне. Паводле чутак, на тэрыторыі сядзібы было вайсковае пахаванне часоў Першай сусветнай. Мясцовыя жыхары паказвалі на пляцоўку паміж кароўнікам (1909 г. пабудовы) і новай кузняй. Сапраўды, аб тым, што там магло быць брацкае пахаванне, сведчыў даволі вялікі земляны горб. Але, як высветлілася пад час размовы з Аляксеем Смаршчком (1934 г.нар.), жыхаром в. Грушаўка, у 1960 г. па загадзе мясцовай улады ўсе воінскія пахаванні было вырашана перанесці ў адно месца. Спачатку эксгумавалі парэшткі загінулых у Першай сусветнай. Пахавалі іх там, дзе раней была старая капліца Рэйтанаў. З часам туды перанеслі і рэшткі савецкіх салдатаў, якія загінулі з 1941 па 1944 г. Цяпер на гэтым месцы невялічкі бярозавы гаёк і абеліск. Праўда, няма ніякай шыльды, прысвечанай ахвярам Першай сусветнай вайны.

Каля капліцы Рэйтанаў (ліпень 1917 г.)

На наш погляд, прадстаўнікам мясцовых уладаў варта было б зрабіць адмысловы запыт у Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь і па выніках адказу годным чынам ушанаваць памяць салдатаў даўняй вайны, сярод якіх павінны быць і нашы землякі, якіх у расійскае войска прызвалі каля 800 тысячаў.

Мы звяртаемся да чытачоў «Краязнаўчай газеты» з просьбай. Калі вам патрапяцца фотаздымкі (што раней не друкаваліся) сядзібы, капліцаў Рэйтанаў у Грушаўцы і Ляхавічах, касцёла Св. Язэпа ў Ляхавічах, калі ласка, паведаміце нам праз рэдакцыю «КГ». Мы збіраем матэрыялы для будучага музея ў радавым котлішчы Рэйтанаў, які, раней ці пазней, там паўстане.

Зміцер ЮРКЕВІЧ,
Арт-суполка
імя Тадэвуша Рэйтана

Грушаўская сядзіба. У мезаніне месцілася чарцёжная фотаметрычнай часці (чэрвень 1916 г.)

Аэрафатограф з камерай Graflex

Сустрэчы ў азёрным краі

Сябры Пастаўскай раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны актыўна папулярызуюць нашую мову і культуру, кнігі і матэрыялы пра родны край. Адбываецца гэта найчасцей пад час сустрэчаў у навучальных установах, бібліятэках, дамах культуры.

Фота на памяць з удзельнікамі літаратурнага гуртка «Выток»

Напрыканцы кастрычніка сябры раённай арганізацыі ТБМ наведалі Будслаўскую сярэднюю школу (Мядзельскі раён). Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня Пастаўскай раённай арганізацыі ТБМ Ігар Пракаповіч і бібліятэкар Пастаўскай дзіцячай бібліятэкі, аўтар сцэнарыяў відэафільмаў і літаратурна-мастацкіх вечарынаў Людміла Сяменас пазнаёміліся з экспазіцыяй школьнага краязнаўчага музея і выступілі перад настаўнікамі і вучнямі.

Пад час сустрэчы ішла гаворка пра сучасны стан і перспектывы развіцця беларускай мовы, пра шляхі папулярызацыі яе ў грамадстве, а таксама пра неабходнасць збору краязнаўчых матэрыялаў, асабліва пра вёскі, якія імкліва знікаюць з карты Беларусі. І. Пракаповіч расказаў пра свае паэтычныя, празаічныя і краязнаўчыя кнігі (усяго іх каля 40), засяродзіў увагу на выданнях, што былі напісаныя разам з вучнямі. Л. Сямянас распавяла пра здымкі фільмаў пра Янку Купалу, М. Багдановіча, У. Дубоўку, пастаноўку спектакля «Як мужык жонку шукаў».

Вучні Крывіцкай школы слухаюць гасцей

І. Пракаповіч у Старагабскай школе

Свае вершы і вершы І. Пракаповіча прачыталі ўдзельнікі літаратурнага гуртка «Выток», якім кіруе настаўніца Валянціна Грыбовіч.

У той жа дзень адбылася сустрэча і ў школе г.п. Крывічы, арганізаваная настаўніцай гісторыі Алай Ермаковіч. Для настаўнікаў і вучняў старэйшых класаў былі паказаныя прэзентацыі, відэаролікі і ўрыўкі з фільмаў пра краязнаўчыя і паэтычныя выданні Пастаўшчыны, пра знакамітых дзеячаў беларускай культуры нашага рэгіёна. Усе мультымедыйныя матэрыялы былі перададзеныя ў падарунак школе.

Паездка ва ўсходнюю частку Мядзельскага раёна адбылася 11 лістапада: сябры арганізацыі выступалі ў Слабадской, Старагабскай і Сваткаўскай школах. Мэта сустрэчаў – заахвоціць вучняў і настаўнікаў да вывучэння роднай мовы і карыстання ёю ў паўсядзённым жыцці, а таксама распавесці пра каштоўнасць збору, упарадкавання і выдання краязнаўчых матэрыялаў, асабліва пра населеныя пункты і іх жыхароў.

Перад школьнікамі выступіў настаўнік геаграфіі пастаўскай гімназіі І. Пракаповіч, які падзяліўся досведам збору краязнаўчых матэрыялаў, паказаў выдадзеныя кнігі, прачытаў некаторыя творы. Асобна падкрэсліў, што ў вывучэнні родных мясцінаў і стварэнні іх летапісаў вельмі важнай з'яўляецца сумесная праца вучняў і настаўнікаў.

Каб зацікавіць школьнікаў вывучэннем роднага краю, у прэзентацыю былі ўключаныя фотаздымкі адметных мясцовых аб'ектаў і творчых асобаў, зробленыя сябрамі ТБМ пад час летніх краязнаўчых вандровак па Мядзельшчыне.

Хочацца спадзявацца, што сустрэчы не прайшлі марна і будуць мець пэўны вынік: магчыма, хтосьці з вучняў пачне пісаць вершы, хтосьці памкнецца збіраць краязнаўчыя матэрыялы, а нехта задумаецца пра стан беларускай мовы і будзе яе актыўным прыхільнікам і носьбітам.

Юлія ПРАКАПОВІЧ

Ад рэдакцыі. ***Днямі Ігар Пракаповіч адзначыў 55-годдзе. Віншуем нашага чытача, аўтара і сябра з важкаю датай і зычым здароўя, новых знаходак і адкрыццяў, плёну ў краязнаўчай і педагагічнай дзейнасці.***

Працяг тэмы

Капліца Дуніных-Слепсцяў

Перспектывы і магчымасці

18 і 19 лістапада адбыўся выезд прадстаўнікоў Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў Віцебск па пытанні захавання і рэстаўрацыі капліцы-пахавальні Дуніных-Слепсцяў сярэдзіны XIX ст., што знаходзіцца на тэрыторыі батанічнага саду Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.

Грамадскае аб'яднанне пісьмова ўжо звярталася ў мясцовыя выканаўчыя органы і да кіраўніцтва ўніверсітэта з прапановамі па захаванні і аднаўленні гістарычнага будынка, які, на жаль, не мае статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У межах гэтых прапановаў і адбыўся працоўны выезд, пад час якога праведзеныя натурныя вышуканні на аб'екце, адбылася сустрэча прадстаўнікоў Таварыства з кіраўніцтвам універсітэта з удзелам прадстаўнікоў аблвыканкама і гарвыканкама.

На сустрэчы абмеркаваныя праблемы захавання, рэстаўрацыі і функцыянальнага прызначэння былой капліцы, дасягнутая дамоўленасць аб каардынацыі дзеянняў у гэтым накірунку і перспектыўныя накірункі супрацы па рэгенерацыі гістарычнага будынка, які ў будучым можа стаць адным з прыцягальных гісторыка-культурных аб'ектаў горада.

Нашым грамадскім аб'яднаннем распрацаваны шэраг праектаў дакументаў па наладжванні комплексу сумесных мерапрыемстваў па праблеме захавання, рэканструкцыі і рэстаўрацыі будынка былой капліцы-пахавальні ў г. Віцебску. У яго ўваходзяць праекты Пагаднення аб намерах па рэстаўрацыі капліцы-пахавальні, Дамовы аб сумеснай дзейнасці, Палажэння аб Назіральным савеце дабрачыннага рахунка па рэстаўрацыі капліцы-пахавальні і інш. Праекты высланыя на разгляд кіраўніцтва Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у аператыўным кіраванні якога знаходзіцца будынак.

Антон АСТАПОВІЧ,
старшыня БДТАПТіК

Наш каляндар

Брэсцкі манетны двор – 350 гадоў з дня заснавання

Брэсцкі манетны двор – адзін з цэнтраў манетнай вытворчасці ў Рэчы Паспалітай. Створаны ў Брэсце ў час грашовай рэформы 1659 – 1666 гг. для выпуску меднага соліда (барацінкі) згодна з рашэннем Варшаўскага сейма ад 22 сакавіка 1659 г. Працаваў манетны двор з 4 снежня 1665 г. да 16 снежня 1666 г. на падставе віленскага пагаднення ад 6 чэрвеня 1665 г. паміж прадстаўніком земскага скарбу ВКЛ і Цырусам Банданэлі, які кіраваў Брэсцкім манетным двором у якасці арандатара Ціта Лівія Бараціні (ад яго імя паходзіць іншая назва солідаў – барацінкі). За час працы двор выбіў каля 241 мільёна медных солідаў на суму 2 674 268 злотых 10 грошаў. На аверсе – партрэт Яна II Казіміра, вакол надпіс IOAN CAS REX, пад партрэтам манаграма Бараціні – TLB. На рэверсе – выява герба ВКЛ «Пагоня», вакол надпіс SOLI MAG DVC LIT 1665/1666. Над Пагоняю вялікакняская карона, пад Пагоняю манаграма вялікага падскарбія літоўскага І. Кіршэнштэйна – KHPL. Некаторыя беларускія даследчыкі сцвярджаюць, што гэта першае ў гісторыі Рэчы Паспалітай ужыванне на манетах не лацінскага, а польскага ці беларускага скароту. Соліды Брэсцкага манетнага двара падобныя да барацінак, выбітых на Віленскім манетным двары. Ёсць меркаванне, што большая частка тыражу мае адметныя рысы: шчыт з вострым вуглом, малая манаграма, палеаграфічныя асаблівасці.

Падрыхтаваў Алесь САЧАНКА

Барацінка 1665 г.

Асоба і час Мікалая Апіёка

25 лістапада ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адбылося адкрыццё персанальнай выстаўкі «Час і асоба» Мікалая Апіёка, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, уганараванага ордэнам Францыска Скарыны, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», кіраўніка студыі ваенных мастакоў. Выстаўка прысвечаная 70-годдзю Перамогі і прымеркаваная да 80-гадовага юбілею творцы.

Экспазіцыю складаюць больш за 70 працаў станковага жывапісу розных гадоў, адабраных мастаком з тэматычных цыклаў «Беларуская вёска», «Вялікая Айчынная», «Героі спорту», «Акцёр і роль», «Дзеячы беларускай культуры», «Скаральнікі космасу», «Гістарычны летапіс», «Вайсковыя будні», «Ветэраны Вялікай Айчыннай» і інш.

На палотнах захаваны своеасаблівы зрэз часу. Падзеі, убачаныя вачыма мастака, творча перапрацаваныя і ўвасобленыя ў жывапісных вобразах. Нацюрморты і краявіды дапаўняюць паўвекавую творчую справаздачу аўтара.

Значнае месца ў экспазіцыі адведзенае партрэтам майстроў беларускай сцэны: народных артыстаў Я. Глебава, С. Станюты, А. Памазана, Л. Давідовіч, М. Кірычэнкі, заслужаных артыстаў У. Рагаўцова, Г. Давыдзькі, Т. Мікалаевай, рэжысёраў В. Раеўскага, Б. Герлавана, драматурга А. Дударава. Дарэчы, усе партрэты выкананыя з натуры.

Цікавасць Мікалая Апанасавіча да тэатра невыпадковая. Прафесійную дзейнасць ён пачынаў мастакам-пастаноўшчыкам у Гродзенскім абласным драматычным тэатры, быў аўтарам сцэнаграфіі больш трыццаці пастановак у розных тэатрах Беларусі. З тэатрам яго назаўсёды злучыла і спадарожніца жыцця – актрыса Тамара Мікалаева.

Добра ведае былы хлопчык з вёскі Макараўка, што на Дубровеншчыне, жыццё працаўнікоў зямлі, таму ў экспазіцыі больш за 10 эскізаў і карцінаў, дзе адлюстраваныя сцэны вясковага побыту.

У тэматычным цыкле, прысвечаным дзеячам культуры, прадстаўленыя партрэты В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Багдановіча, Я. Янішчыц, І. Лучанка, У. Мулявіна.

Значнае месца адведзенае вайсковай тэматыцы. 12 гадоў узначальвае Мікалай Апанасавіч творчы калектыў студыі ваенных мастакоў пры Цэнтральным доме афіцэраў Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Да свята Перамогі студыя арганізавала чатыры мастацкія выстаўкі.

Вялікую цікавасць гледачоў выклікалі найноўшыя працы з тэматычнага гістарычнага цыкла летапісу зямлі беларускай: «Нараджэнне крыжа» і вялікае эпічнае палатно «Усяслаў Чарадзей», над якім мастак працаваў з 2007 па 2015 г.

Падзякаваць Мікалаю Апанасавічу за ўнёсак у патрыятычнае выхаванне і выяўленчае мастацтва краіны прыйшлі кіраўнікі ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі, упраўлення культуры Мінгарвыканкама, Беларускага саюза мастакоў, Беларускага прафсаюза работнікаў культуры. Віншавальныя словы выказалі таксама калегі па студыі ваенных мастакоў. Дырэктар Музея гісторыі Мінска Галіна Ладзісава зачытала віншавальны ліст Дубровенскага райвыканкама. Выступоўцы адзінадушна выказвалі захапленне творцам, які з'яўляецца прыкладам грамадзяніна і мастака.

Дачка Мікалая Апанасавіча, ганаровы член Расійскай акадэміі мастацтваў Наталля Апіёк, перадала бацьку прывітанні ад старшыні Расійскай акадэміі мастацтваў З. Цэрэтэлі, студыі вайсковых мастакоў імя М.Б. Грэкава і паведаміла, што юбіляр уганараваны Падзякай Расійскай акадэміі мастацтваў. Свае музычныя падарункі паднеслі салісты акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Партрэт І. Лучанка

М. Апіёк каля карціны «Усяслаў Чарадзей»

Наталі КУПРЭВІЧ
Фота аўтара

Заснаванне Магілёўскай акадэміі ў планах гетмана Пятра Дарашэнкі

У 1666 г. Украінская казацкая дзяржава – Гетманшчына – была падзеленая на дзве часткі па Дняпры. Левабярэжная Гетманшчына была аўтаномнаю адзінкаю пад уладаю Маскоўскай дзяржавы; і гэтая аўтаномія паступова знішчалася. Правабярэжная Гетманшчына і далей змагалася з Рэччу Паспалітай за сваю незалежнасць, хаця з прычыны абставінаў дапускала ўваходжанне ў яе склад як раўнапраўнага члена канфедэрацыі. Тагачасны гетман Правабярэжнай Украіны Пятро Дарашэнка (валадарыў у 1665 – 1676 гг.) праводзіў складаную дыпламатычную гульню з Варшавай, Масквой, Стамбулам, Бахчысараем... Некаторыя ягоныя дыпламатычныя інструкцыі за 1669 – 1670 гг. (украінскім паслам у Рэч Паспалітую) былі выяўленыя намі ў Галоўным архіве даўніх актаў у Варшаве.

Адстойваючы інтарэсы Украіны, гетман у 1669 г. на элекцыйным сейме (тады каралём абралі Міхала Вішнявецкага) ставіў таксама і пытанне яе культурнага развіцця. Так, ён дамагаўся пацвярджэння акадэмічнага статусу знакамітай Кіева-Магілянскай акадэміі, нададзенага ёй яшчэ ў 1659 г. каралём Янам Казімірам, адкрыцця аналагічнага цэнтра ў Гошчы (непадалёк Астрога на Валыні). Тут жа ён дабіваўся вольнага адкрыцця такіх праваслаўных установаў, як і «ў Белай Русі ў месце Магілёве з тае ж умоваю, каб там не было ніякіх іншых школаў, асабліва айцоў езуітаў, і каб усё, што належыць тым акадэміям і школам, былі вольныя ад усялякіх жаўнерскіх падаткаў». Варшава схілялася да прыняцця гэтага пункта, але не пагаджалася на зацвярджэнне іншых. 2 кастрычніка 1670 г. да караля Міхала Вішнявецкага было накіраванае новае пасольства (Петраноўскі і Тарасенка), якое перадало патрабаванні ў Варшаве 2 снежня 1670 г. Тут пункт пра «школы» выкладаўся больш разгорнута: у Кіева-Магілянскай акадэміі мусілі «грэцкаю, лацінскаю і руськаю моваю навучаць русь і каб яна правамі і вольнасцямі была так умацаваная, як Кракаўская (*Акадэмія*)», а каб не было канфліктаў «між студэнтамі і жакамі», вымагалася, каб у Кіеве былі ліквідаваныя неправаслаўныя школы. «Другую ж акадэмію ў беларусім Магілёве або тут ва Украіне, дзе ёй знойдзецца зручнае месца для заснавання, было вольна заснаваць, каб тая такім жа чынам, як і кіеўская, была ўмацаваная правамі і вольнасцямі». Пункт гэты дапаўняўся палажэннем, што «без цяжкасцяў можна было б закладаць гімназіі ды школы, у якіх па латыні будуць вучыць, і друкарняў, колькі будзе патрэбна, вольна выкладаць навукі і друкаваць вялікія кніжкі».

На жаль, з-за цяжкіх для Украіны знешнепалітычных абставінаў гэты праект не быў рэалізаваны, хаця Кіева-Магілянская акадэмія працягвала існаваць і квітнець.

У дыпламатычных інструкцыях Дарашэнкі размова вялася пра Беларусь не толькі ў сувязі з Магілёвам. Ставілася запытанне пра вяртанне Ляшчынскага манастыра на Піншчыне праваслаўным, пра беларускія епархіі (Віцебска, Навагрудка, Менска, Полацка ды інш.), пра заходнія межы Правабярэжнай Гетманшчыны, да якой мусілі ўвайсці таксама паветы «Пінскі, Мазырскі, Рэчыцкі, паколькі яны раней пад нашымі гарнізонамі былі і мы ім правы надалі...». У гэтым разе Дарашэнка працягваў палітыку Багдана Хмяльніцкага, род якога, між іншага, быў звязаны з Беларуссю, а зяць Б. Хмяльніцкага – Даніла Выгоўскі – быў турава-пінскім палкоўнікам, а другі зяць – Іван Нячай – бараніў Быхаў (пазней ён быў бабруйскім, а яшчэ пазней – загальскім старастам). Гэтае пытанне вымагае больш дасканалага разгляду, а тут адзначым, што ў гады нацыянальна-вызвольнай вайны ўкраінскага народа 1648 – 1658 гг. у паўднёвай і цэнтральнай Беларусі ствараліся, як і ва Украіне, казацкія палкі (і не толькі вайсковыя, але і тэрытарыяльныя адзінкі), напрыклад, Брагінскі, Турава-Пінскі, Беларускі.

Тыя дыпламатычныя інструкцыі гетмана П. Дарашэнкі (які быў, між іншага, продкам Мікалая Гогаля і Наталлі Ганчаровай, жонкі Аляксандра Пушкіна) – важныя сведчанні не толькі ўкраінска-беларускіх сувязяў, але й выбітнай ролі Магілёва як культурнага цэнтра Беларусі ў XVII ст.

Айцец Юрый МЫЦЫК,
доктар гістарычных навук, прафесар,
г. Кіеў (Украіна)

(Пераклад з украінскай мовы Уладзіміра Пучынскага)

Жыццёвая дарога Веры

Напрыканцы лістапада ва Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Труса адбылася прэзентацыя кнігі «Жыццёвая дарога» Веры Лукашэвіч – загадчыцы аддзела сельскай гаспадаркі раённай газеты «Чырвоная зорка».

Выданне склалі дарожныя нататкі, дакументальныя звесткі пра жыхароў Узды і вёсак раёна. Геаграфія кнігі шырокая: вёскі Возера і Каралёва на ўсходзе раёна; Цеплень, Хатляны, Лоша, Губіна – паўднёвая яго ўскраіна, па дарозе ў Пухавічы; Пад'ельнікі і Падсадскія – на мяжы з Капыльшчынай; Сыманчыцы, Цялякава, Чырвоная Ніва, Кухцічы, Гарадок, Тычынкі – цэнтральная частка.

Кніга ўтрымлівае тры раздзелы: «Праз полымя вайны» (аб ветэранах Вялікай Айчыннай і вайны ў Афганістане); «Гартаючы сямейны альбом» (тэма сямейнага ўкладу); «Святло захапленняў» (майстры Уздзеншчыны).

«Жыццёвая дарога» чытаецца лёгка і хутка. І галоўнае ў кнізе – людзі, якія жывуць у гэтым прыгожым куточку нашай Беларусі, узбагачаюць край сваёй рупнасцю, майстэрствам, шанаваннем традыцыяў.

В. Лукашэвіч называе сваю кнігу эксперыментам. А мы лічым, што гэта вельмі

ўдалы эксперымент, бо ён істотна папоўніў скарбонку роднага краю. Тым больш, што ў аўтаркі ёсць новыя напрацоўкі. Пажадаем ёй плёну.

Ліана ТАПАДЗЭ, бібліятэкар Уздзенскай ЦРБ імя П. Труса

Такой выпускніцай варта ганарыцца

У сярэдзіне лістапада экскурсаводы народных музеяў «Вілейшчына літаратурная» і «Ільянскія далягляды» віталі колішнюю выпускніцу школы Святлану Язерскую. Святлана Анатольеўна не толькі вучылася ў Іллі – першыя пяць гадоў пасля заканчэння Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага яна працавала ў роднай школе, выкладала беларускую мову і літаратуру, музыку і спевы. Пазней была аспірантура і набытая спецыяльнасць «методыка выкладання беларускай мовы».

У арсенале Святланы Анатольеўны – 167 навуковых працаў: каляндарна-тэматычнае планаванне, падручнікі, нарматыўныя дакументы, метадычныя дапаможнікі для студэнтаў і настаўнікаў. Яна – удзельніца рабочай групы пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь па падрыхтоўцы новай рэдакцыі «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», член журы Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры, удзельніца канферэнцыяў і семінараў у сферы адукацыі, лектар для настаўнікаў-мовазнаўцаў. Таксама прафесар Язерская з'яўляецца каардынатарам секцыі беларускай мовы і літаратуры Навукова-метадычнага савета пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, членам рэдакцыйнай калегіі навукова-метадычнага часопіса «Беларуская мова і літаратура».

Нам было надзвычай прыемна атрымаць ад шаноўнай госці кнігі з аўтографамі, цікавыя фотаздымкі. Экскурсаводы мелі выдатны ўрок беларускага маўлення, атрымалі новы матэрыял для музейных экспазіцыяў і, безумоўна, прыклад працавітасці і мэтанакіраванасці. Ільянская школа з поўным правам можа ганарыцца сваёй выпускніцай.

Роза ШЭРАЯ, кіраўнік народнага музея «Вілейшчына літаратурная»

Святлана Язерская (справа)

Іканапісец з Баранавічаў

6 лістапада, напярэдадні Дзімітраўскай памінальнай суботы, у музеі-сядзібе «Пружанскі палацык» адкрылася выстаўка іконаў. Упершыню ў Беларусі свае працы прадставіў наш зямляк з Баранавічаў Сяргей Шавырын, сябра Саюза мастакоў Расіі. Наведаць выстаўку можна да 25 студзеня.

Гэтыя іконы незвычайныя, як лёс мастака. Нарадзіўся Сяргей на Далёкім Усходзе, на самай мяжы з Кітаем, у сям'і вайскоўца. Дзяцінства і юнацтва хлопца прайшло ў Баранавічах, там ён скончыў сярэднюю школу № 1, пасталеў. Глыбокія беларускія карані Сяргея Канстанцінавіча назаўсёды знітавалі яго з нашым краем, і куды б ён ні з'язджаў, заўсёды вяртаўся ў родны горад.

С. Шавырын

Маці мастака Лідзія Мануйлава была родам з Мінска. Гісторык па адукацыі, у свой час яна чытала лекцыі ў Беларускім таварыстве «Веды». Дзед па маці Пётр Мануйлаў, паводле дадзеных Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны, быў начальнікам метэастанцыі, памёр ад хваробы ў лістападзе 1944 г., пахаваны ў Брэсце.

З дзяцінства Сяргей цягнуўся да прыгожага, любіў маляваць. Калі вучыўся ў старэйшых класах, падарыў сяброўцы-музыку выдатны партрэт Людвіка Бетховена, і тая напрарочыла, што хлопец будзе мастаком. Так і атрымалася: праз спробы і пошукі Сяргей прыйшоў у мастацтва. Спачатку зацікавіўся пластыкай – вучыўся і працаваў амаль 30 гадоў у вядомага маскоўскага скульптара па метале Міхаіла Кірылава, творы якога

Іаан Багаслоў

ўпрыгожваюць Новы Арбат. А сама майстэрня, у якой і цяпер часам працуе С. Шавырын, знаходзіцца на Старым Арбаце, дзе сёння разам з ім працуе прадаўжальнік скульптурнай дынастыі Вадзім Кірылаў.

Шмат гадоў С. Шавырын працаваў у іканапісных і багетных майстэрнях, што пазней вельмі дапамагло яму ў афармленні ўласных працаў. Аднаўляў таксама храмы і манастыры.

Ахрышчаны ва ўзросце Хрыста і духоўна акрылены, Сяргей Канстанцінавіч пачаў пісаць абразы, трыццаць сем з якіх упрыгожылі выставачную залу Пружанскага палацыка. Яго творы перадаюць аўтарскі погляд на кананічную традыцыю іканапісу.

Тэмы для творчасці мастак выбірае па асаблівым, невытлумачальным натхненні. Сяргей Канстанцінавіч творыць так, як умее, проста і ад чыстага сэрца. Яго іконы перадаюць схаваныя малітоўныя хваляванні душы, ад іх вее жыватворным спакоем. На пытанне, што з'яўляецца галоўным у яго працы, мастак адказвае словамі апостала Паўла: «Усё, што робіце, рабіце ад душы, як для Госпада». Ён усведамляе, што напісанне іконаў – гэта вялікая адказнасць, таму перад стварэннем новага абраза вывучае духоўную літаратуру. Трэба сказаць, што першыя кнігі па іканапісе мастаку падарыла маці, дарэчы, чалавек няверуючы. Вось так, дзякуючы ёй, творца дакрануўся да святой прыгажосці.

Шмат гадоў працуючы над абразамі, мастак змяніў сваё стаўленне да жыцця: адмовіўся ад шкодных звычак, часта наведвае храмы ў родных Баранавічах. Самыя дарагія яго сэрцу – царква Святых Жонак-Міраносіцаў і Пакроўскі сабор, дзе С. Шавырын любуецца працамі вучняў школы Васняцова (менавіта ў гэтым храме захаваліся фрэскі з былога сабора Аляксандра Неўскага, разбуранага ў Варшаве ў 1920-я гг. – **«КГ»**).

Цяпер мастаку 60 гадоў. Ён працягвае пісаць, у гэтым і бачыць сваё шчасце, бо творчасць для яго – гэта стан душы. Многая лета вам, шаноўны Сяргей Канстанцінавіч!

Алена ЗЯЛЕВІЧ, старшы навуковы супрацоўнік музея-сядзібы «Пружанскі палацык»

Святыя Кірыла і Мяфодзій

Снежань

18 – Ходзька Іосіф Іванавіч (1800, Мядзельскі р-н – 1881), географ, геадэзіст, тапограф, ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, ганаровы член Рускага геаграфічнага таварыства – 215 гадоў з дня нараджэння.

19 – Лемцюгова Валянціна Пятроўна (1935, Расія), мовазнаўца, патрыярх беларускай тапанімікі – 80 гадоў з дня нараджэння.

19 – Шырокаў Мікалай Артамонавіч (1920, Гомель – 1996), графік, заслужаны работнік культуры Беларусі (1981) – 95 гадоў з дня нараджэння.

20 – Альхімовіч Казімір Дамінікавіч (1840, Шчучынскі р-н – 1916), жывапісец, графік, творчасць якога звязаная з мастацкім жыццём Польшчы, Беларусі і Літвы, аўтар гістарычных палотнаў і серыі карцінаў па матывах творчасці А. Міцкевіча, удзельнік паўстання 1863 – 1864 гг. – 175 гадоў з дня нараджэння.

20 – Гутковіч Аляксандр Залманавіч (1920, Бешанковіцкі р-н – 1989), акцёр, рэжысёр тэлебачання, драматург, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966) – 95 гадоў з дня нараджэння.

20 – Марыкс Аскар Пятровіч (1890, Украіна – 1976), мастак тэатра, графік, педагог, адзін з заснавальнікаў дэкарацыйнага мастацтва ў беларускім савецкім тэатры, народны мастак Беларусі – 125 гадоў з дня нараджэння.

20 – «Настаўніцкая газета» (Мінск; 1945), выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь – 70 гадоў з пачатку выдання.

20 – Шуцько Іван Цітавіч (1925, Крупскі р-н – 1984), пісьменнік, аўтар кніг вершаў, казак і апавяданняў для дзяцей, баек і мініяцюраў – 90 гадоў з дня нараджэння.

20 – Ядкоўскі Юзаф (1890, Гродна – 1950), беларускі і польскі археолаг, нумізмат, гісторык мастацтва, вядомы гродзенскі краязнаўца і заснавальнік Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея – 125 гадоў з дня нараджэння.

21 – Аладаў Мікалай Ільіч (1890, Расія – 1972), кампазітар, педагог, адзін з арганізатараў Беларускага музычнага тэхнікума і кансерваторыі (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі), народны артыст Беларусі, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» – 125 гадоў з дня нараджэння.

21 – Краўчанка Валянціна Захараўна (1925, Расія – 1984), актрыса тэатра і кіно, заслужаная артыстка Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

21 – Ціханенкаў Іван Міхайлавіч (1935, Расія – 2002), археолаг, даследчык каменнага веку Падняпроўя і Падзвіння – 80 гадоў з дня нараджэння.

22 – Байрачны Мікалай Іванавіч (1950, Азербайджан), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, аўтар твораў у станковай скульптуры, медальерным мастацтве, графіцы, мультыплікацыі – 65 гадоў з дня нараджэння.

22 – Хмара Адам Міхал Станіслаў (1720 – 1805), дзяржаўны дзеяч ВКЛ – 295 гадоў з дня нараджэння.

23 – Грыбава Ала Уладзіміраўна (1935, Мінск), мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, жывапісец – 80 гадоў з дня нараджэння.

23 – Катаеў Віталь Вітальевіч (1925, Расія – 1999), беларускі і расійскі дырыжор, заслужаны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі – 90 гадоў з дня нараджэння.

23 – Мацюшэўская Ала Анатольеўна (1950, Азербайджан), мастак-плакатыст, мультыплікатар – 65 гадоў з дня нараджэння.

23 – Тамашоў Даніла Парфіравіч (1875, Клімавіцкі р-н – 1926), майстар і рэстаўратар смычковых інструментаў – 140 гадоў з дня нараджэння.

24 – Селях-Качанскі Вячаслаў Антонавіч (1885, Лагойск – 1976), беларускі і расійскі спявак, рэжысёр, педагог, музычна-грамадскі і тэатральны дзеяч, які спяваў на сцэне Марыінскага і Александрынскага тэатраў (Пецярбург), арганізатар Беларускага студыйнага хору (цяпер Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь), пастаноўшчык першай на беларускай мове оперы «Русалка» А. Даргамыжскага – 130 гадоў з дня нараджэння.

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

НІТЫ́ – прыстасаванне ў кроснах для прапускання асновы ў адпаведнасці з узорам і ўтварэння зева для ўточнай ніткі; ніцяныя петлі (кабылкі), размешчаныя на 2 гарызантальных пруточках. Былі рухомымі і зверху мацаваліся на кацёлках, а знізу злучаліся з панажамі. Даўжыня нітоў адпавядала шырыні асновы, вышыня раўнялася 24 – 25 см.

Вядомыя дзве разнавіднасці: без вочак і з вочкамі. Найбольш старажытны, пашыраны ва ўсіх усходніх славянаў – ніт без вочак, які вырабляліся на спецыяльнай дошцы (шырынёй 12 – 13 см і даўжынёй 65 – 70 см). Зверху па даўжыні рабра дошкі прапускалі тоўстую нітку-жывіцу, на якой мацаваліся ў выглядзе пецель суканыя ніткі. Пасля таго, як дошка запаўнялася петлямі, іх ссоўвалі і зверху прадзявалі пруток, а на дошку накідалі новыя, захопліваючы петлі першага рада. У выніку атрымліваўся ніт з двух радоў пецель, злучаных у цэнтры (у час накідання асновы ў ніты на пальцы левай рукі накручвалі ніткі з верхняга і ніжняга радоў, утвараючы вочкі, куды прапускалася аснова). Ніты з вочкамі, больш зручныя пры накіданні асновы, рабілі на спецыяльным станочку (драўляны брусок даўжынёй 25 – 27 см з 4 цвічкамі). Спачатку нітку мацавалі на першым крайнім цвічку, затым на сярэдніх і другім крайнім цвічку (ніты такім спосабам рабілі на поўначы і паўночным захадзе Беларусі). У заходніх раёнах ніты ніцілі на спецыяльным станочку – варотцах – тры злучаныя пруточкі, гарызантальна ўмацаваныя на падстаўцы.

Для ткання на кроснах неабходна было не менш двух нітоў, таму ў залежнасці ад колькасці нітоў атрымлівалі двух-, трох-, чатырох- і шматнітовыя тканіны.

Чытаем Максіма Багдановіча

У крыжаванку неабходна ўпісаць прапушчаныя словы з вершаў Максіма Багдановіча, паставіўшы іх у назоўны склон адзіночнага ліку.

Уздоўж

7. Ой, Лявоніха, Лявоніха мая! // Ты пяяла галасней ад […]. **8**. Сцюжа, мрок… Я ізноў хвараваты. // Ў сэрцы – думак дакучных цяжар. // Заварыць бы гарачай гарбаты, // Разагрэць бы хутчэй […]. **11**. Блішчыць у небе зор пасеў; // У полі – рунь і ў небе – рунь. // Да рэчкі лецячы, ўзляцеў // Між імі […] белы лунь. **12**. Я пабляднеў ад горкіх слёз // І […] пачаў славамі: // Мне доўгае расстанне з Вамі // Чарней ад Вашых чорных кос. **13**. Буду ў далекім […] я нудзіцца, // Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю; // Кожную ночку на зорку дзівіцца // Буду ў далёкім […]. **14**. Звярнуў калісь […] на вулкі // З прывольных палявых дарог, // І пракаціўся топат гулкі, // І іскры сыпнулі з-пад ног. **16**. Мы гаворым удвух пры агні ў цішыне. // Рупна […] пісанку малюеш ты мне. // **17**. І не спім мы адны – // Я ды чорны […], што шнуруе ля вежы. **21**. Верш такі – як дар прыроды, // Вінаграднае, густое, цёмнае […]: // Дні ідуць, праходзяць годы, – // Але ўсё крапчэй, хмяльнее робіцца яно. **22**. […], цыклон, […] на мора, // Цалуй яго ў глухое дно, // Ўсплясні ваду – і перлаў горы // На бераг выкіне яно. **23**. Песня пяе, як удовіна сына, // […], каханне згубіла; // Там, дзе панура схілілась каліна, // Беднага хлопца магіла. **24**. Народ, Беларускі Народ! // Ты – цёмны, сляпы, быццам […]. **27**. Так у гулянках пралятала // Маё дзіцячае жыццё, // А поруч ціхае дзіцё, // […] Забелаў, узрастала. // Яе я мала знаў: яна // Ўсягды была сама, адна. **28**. Шмат што зрабілі іх чорныя рукі, // Вынеслі моцныя […]; // Шмат іх прымусілі выцерпець мукі // Пушчы, разлогі, нізіны. **31**. Сеў хлопчык з шкляначкай ля вулічнага […] // І выдувае з мыла пузыры. // Вясёлкаю гараць яны ў зіянні ранку, // Узлятаючы ў паветра да гары. **34**. Кінь толькі вокам да гэтага люду – // Сціснецца сэрца ад болю: // Столькі пабачыш ты […] усюды, // Столькі нуды без патолі. **36**. Музыкі стагнанне ліецца па вулках з […], // Гараць і агнём машкару к сабе вабяць ліхтарні. **37**. Засараміўшыся, чыж так пачаў казаць: // «Я гэтым не зрабіў благога. // Дай бог […] варонай не назваць; // Варону жа […] – нічога». **38**. А завернеш ў […] – ён цесны, крывы; // Цёмны шыбы глухіх, старасвецкіх будынкаў; // Між каменнямі – мох і сцяблінкі травы. **39**. «Шырсцяніха, шырсцяніха мая. // Пакахала камара-[…]. // А камар не зважае на яе, // Толькі лётае ды песні пяе».

Упоперак

1. Жывеш не вечна, […], – //Перажыві ж у момант век! **2**. Помніш толькі красу, // Мілы тварык дзявочы, // Залатую […], // Сіняватыя вочы. **3**. За дахамі […] памеркла нябёс пазалота; // Паветра напоена ціха гусцеючым мрокам; // Ўжо відна, як іскры злятаюць з трамвайнага дрота, // Як зоркі гараць і зрываюцца ў небе далёкам. **4**. Па загаду бурмістра усе, як належа, // Зачынілі ўжо вокны; загасілі агні… // […] вулкай прайшла… **5.** А дальш – за радам кас, ламбардаў, […] – // Агні вакзала… павадка фурманкаў… // Віры людзей… сіпяшчы паравоз… **6**. Калі ў дух мой западзе і заварушыцца // Там […] грубага жыцця, – // Ў жомчуг звернецца ён сілай пачуцця. **9**. Добрай ночы, заразараніца! // Ўжо імгла над зямлёю лажыцца, // Чорнай […] усё пакрывае, // Пылам зор небасхіл абсявае. **10**. Я […] ў багатых прасіў і маліў, – // Яны ж мне каменні давалі; // І тыя каменні між імі і мной // Сцяною вялізнаю ўсталі. **15**. Прывольная, цёмная пушча: // Вялізныя ліпы, дубы, // […], ельніка гушча, // Між хвоі апаўшай – грыбы. **18**. Нам не трэба ні ад чога // Ноччу […]: // А спаткаем чалавека, – // Порт рассцеле ён. **19**. «Я спакойна драмлю пад гарой між кустоў. // Лес прыціхнуў, – ні шуму, ні сокату. // Але чую ў цішы нада мной звон падкоў, // Чую гул мяккі конскага […]». **20**. Захісталася сасонка баравая, // Затужыла дзяўчынанька маладая, // Жартаўлівая пяюшка-сакатушка, // А па імені – […]-зелянушка. **25**. Як пачуў тыя жаласці камарык – // Паскрабаў і […] ён і тварык: // «А чаму бы мне ды з ёй не пажаніцца? // Пэўна, пойдзе, каб болей не журыцца». **26**. Што тут чынілася ў даўнія гады, // Што думалі, чаго жадалі мы тады, // За што змагаліся, як баранілі веру, – // Хай зведаюць усё […] праз паперу! **29**. А за сцяной смяецца […], // Сінее неба з-за акна, – // І думкі мкнуцца мімаволі // Туды, дзе расцвіла вясна. **30**. Ў даль яны памкнулі, і лятуць пад імі // […] ды балоты, поле, бор, лука. // Але што там блішча? Ці не ты, сястрыца, // Ці не ты ліешся, срэбная рака? **32**. Нашых дзедаў душылі […] лясоў, // Не давалі ім жыці праўдзівым жыццём, // І яны тыя пушчы звадзілі агнём, // Іх кругом падпаліўшы з далёкіх канцоў. **33**. На чыстым […], прад вузенькім акном, // Прыгожа літары выводзіць ён пяром, // Устаўляючы паміж іх чорнымі радамі // Чырвоную страку. **35**. […] і сумны і прыгожы // Стаіць з павязкай на вачах // Ля склепу. Часам лёгкі пах // Сюды даносіцца ад рожы. **36**. Ад спёкі дышуць пахі і асфальт, // На вулцы ўецца пыл, і грукаціць фурманка; // «Каробушку» пяе дзіцячы […], // І надрываецца абрыдлая шарманка.

Склала Ірына МЫШКАВЕЦ

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 10.12.2015
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.

Заказ 789.
Тыраж 816 асобнікаў.